# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі**
**"Гомельскі дзяржаўны універсітэт**
**імя Францыска Скарыны"**
**факультэт гісторыі і міжкультурных камунікацый**
**кафедра гісторыі Беларусі**

**запрашаюць 16-17 кастрычніка 2025 г.**
**прыняць удзел**
**у Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі**

# БЕЛАРУСЬ У ГІСТАРЫЧНАЙ РЭТРАСПЕКТЫВЕ XIX – XXI СТАГОДДЗЯЎ:

## этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы

месца правядзення канферэнцыі – Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны, Гомель, вул. Кірава, 119.

*Асноўныя накірункі работы канферэнцыі:*

*1) Этнакультурнае развіццё Беларусі ў XIX– XXI ст.*
*2) Беларусь у кантэксце нацыятворчых і дзяржаўна-палітычных працэсаў XIX–XXI ст.*
*3) Беларусь у гады Другой сусветнай вайны – да 80-годдзя Вялікай Перамогі.*
*4) Сучаснае беларусазнаўства і навуковая спадчына Е. Р. Раманава – да 170-годдзя з дня нараджэння.*

Жадаючым прыняць удзел у рабоце канферэнцыі неабходна даслаць заяўку (фота/скан заяўкі з подпісам аўтара/сааўтараў) і тэкст артыкула (у электронным выглядзе).

**У заяўцы паказаць:**
1. Прозвішча, імя, імя па бацьку. Вучоная ступень, вучонае званне. Установа, пасада.
2. Тэма даклада
3. Форма ўдзелу (вочная, дыстанцыйная, завочная)
4. Кантактны тэлефон, e-mail

Заяўку і электронны тэкст артыкула неабходна даслаць **да 22 верасня 2025 г**. па электроннай пошце: **histbelchair@gsu.by; oksanayaschenko@yandex.ru**
Кантактны тэлефон кафедры гісторыі Беларусі: 8-0232-51-03-29

**Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору матэрыялаў.** Аргкамітэт не дае даведак аб ходзе экспертызы асобных прац. Разглядаюцца матэрыялы, якія яшчэ не друкаваліся. Заяўкі без матэрыялаў даклада ў праграму канфэрэнцыі не ўключаюцца.

Матэрыялы магістрантаў і аспірантаў павінны суправаджацца водзывам кіраўніка (фота/скан водзыва з подпісам кіраўніка). Удзел студэнтаў у канферэнцыі не прадугледжаны.

Накіроўваючы заяўку на канферэнцыю, удзельнік гэтым дае дазвол на апрацоўку персанальных даных.

Удзел у канферэнцыі бясплатны. Камандзіровачныя выдаткі за кошт адпраўляючага боку.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская.

**Патрабаванні да афармлення**

Артыкул аб'ёмам да 12 000 знакаў (памер 14 pt) з улікам прабелаў і спіса літаратуры. Першы радок справа – прозвішча (прозвішчы) і ініцыялы аўтара (аўтараў), ніжэй у дужках горад, назва установы. Праз інтэрвал – назва матэрыялу вялікімі літарамі (па цэнтры). Праз радок – тэкст артыкула. Спасылкі на літаратуру і крыніцы даюцца ў тэксце ў квадратных дужках. Першая лічба – нумар са спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры, наступныя лічбы – старонкі ці аркушы: [1, с. 15–16]. Пасля асноўнага тэксту даецца спіс выкарыстаных крыніц, якія афармляецца у адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Беларусі. Спіс фарміруецца ў парадку з'яўлення спасылак у тэксце.